УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Факультэт дадатковай адукацыі

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы прарэктар БДУКМ
______________________Ю.П.Бондар
“____” __________________2012 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ

**ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНЫ СТАН БЕЛАРУСКІХ ГУЛЬНЯЎ**

спецыяльнасці перападрыхтоўкі
1-17 01 71 Рэжысура свят і відовішчаў
кваліфікацыя: рэжысёр свят і відовішчаў
у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам перападрыхтоўкі,
зацверджаным 03.11.2010 г. № 25-17/197

Мінск 2012

Распрацоўшчык праграмы: Камінскі Алексей Яковлевич, преподаватель кафедры рэжысуры абрадаў і святаў УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, к.п.н., дацэнт

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

Саветам факультэта дадатковай адукацыі УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"
Пратакол пасяджэння ад ______________ № ______

Навукова-метадычным саветам УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"
Пратакол пасяджэння ад ______________ № ______

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УСТУП

Сучасная святочная культура, нажаль, у сваёй большасці скіравана на папулярызацыю канцэртна – відовішчных форм увасаблення драматургічнага матэрыялу, дзе існуе істотны падзел на артыстаў і гледачоў, актыўных удзельнікаў і пасіўных сузіральнікаў святочнага мерапрыемства. У той жа час вывучэнне этнаграфічных першакрыніц і аналіз запісаў палявых матэрыялаў і экспедыцый дазваляе сцвярджаць аб актыўным удзеле розных сацыяльных слаёў і катэгорый вясковага і гарадскога насельніцтва пры падрыхтоўцы і правядзенні свят каляндарнага цыкла. Такім чынам, у сучаснай святочнай культуры ўзнікае неадпаведнасць паміж імправізацыйна – гульнявым пачаткам традыцыйных каляндарных свят і практыкай іх увасаблення.

Вучэбны матэрыял курса разлічаны на вывучэнне і асэнсаванне студэнтамі народных гульнявых традыцый свят каляндарнага цыкла, якія спрыяюць развіццю масава – імправізацыйнай творчасці людзей.

Практычныя заняткі па дадзенаму прадмету прадугледжвваюць знаёмства і авалодванне студэнтам методыкай падрыхтоўкі і правядзення гульні і паслядоўнай працы над сцэнарна – рэжысёрскай, мастацка – вобразнай і музычнай распрацоўкай сюжэтна – гульнявых і конкурсных праграм. Заняткі ва аўдыторыі дапамагаюць будучым спецыялістам пазнаёміцца і засвоіць прафесійныя якасці вядучага гульні метадам сцэнічнага і гульнявага трэнінгу. Для больш глыбокага засваення студэнтамі вучэбнага матэрыялу падчас заняткаў аналізуюцца сцэнарна – рэжысёрскія распрацоўкі гульнявых праграм з архіву кафедры рэжысуры свят.

На працягу навучальнага года студэнты распрацоўваюць агульнагрупавыя і індывідуальныя гульнявыя праграмы, апрабацыя і карэктыроўка якіх адбываецца падчас святочных мерапрыемстваў, наладжаных сіламі выкладчыка – прафесарскага складу кафедры.

Усяго на вывучэнне дысцыпліны адведзена 36 гадзін з іх 16 гадзін аўдыторных (10 - лекцый, 6 - практычныя),  20 гадзін - самастойная работа.

Форма выніковага кантролю – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы, тэмы | Колькасць гадзін | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекц. | практ зан. | інд. зан. | сам. зан. |
| **Уводзіны** | 1 | 1 | | | |
| **Раздзел 1. Асаблівасці рэжысуры тэатралізавана-забаўляльных праграм у народным свяце.** | | | | | |
| Тэма 1. Гульня ў структуры народнага свята | 1 | 1 | | | |
| Тэма 2. Методыка праядзення гульняў | 2 | | 1 | | 1 |
| Тэма 3. Методыка падрыхтоўкі сцэнарыяў гульнявых праграм. | 3 | | 1 | | 2 |
| Тэма 4. Прафесійныя якасці вядучага гульні. Роля вядучага як арганізатара гульні | 3 | 1 | | | 2 |
| Тэма 5.Рэжысёрская распрацоўка сюжэтна-гульнёвай праграмы | 3 | 1 | | | 2 |
| **Раздзел 2. Гульня—спецыфічнае мастацка-імправізацыйнаедзеянне народнага свята.** | | | | | |
| Тэма 6. Традыцыйныя зімовыя ігрышчы беларусаў | 3 | 1 | | | 2 |
| Тэма 7. Абрадавыя і пазаабрадавыя гульнявыя дзеянні веснавых свят народнага каляндара | 2 | 1 | | | 1 |
| Тэма 8. Гульні беларускага Купалля | 2 | 1 | | | 1 |
| Тэма 9. Народныя забавы беларускага кірмашу | 2 | 1 | | | 1 |
| Тэма 10. Гульнёвыя элементы ў структуры летне-асенняга абрадавага цыкла | 2 | 1 | | | 1 |
| Тэма 11. Арганізацыя ўдзельнікаў свята метадам гульні | 2 | 1 | | | 1 |
| Тэма 12. Класіфікацыя сучасных народных гульнева – забаўляльных праграм | 3 | | 1 | | 2 |
| Тэма 13. Арганізацыя пазаабрадавых масава-гульнявых дзеянняў народнага свята | 3 | | 1 | | 2 |
| Тэма 14. Сцэнарна-рэжысёрская распрацоўка конкурснай праграмы. | 4 | | 2 | | 2 |
| **Усяго…** | 36 | 10 | 6 | | 20 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ КУРСА

### Уводзіны

Народная гульня — від актыўнага адпачынку чалавека, гістарычна сфарміраванага на аснове драматызаваных, умоўных або творчых дзеянняў, у якога склаліся пэўныя правілы і прыёмы забаў і які з’яўляецца сродкам фізічнага, разумовага і маральна – эстэтычнага выхавання.

Этымалогія слоў “гульня”, “ігрышчы”. Паходжанне гульні. Гульня як від чалавечай дзейнасці. Функцыі гульні. Развіццё гульнявога жанру ў Беларусі. Характарыстыка народнай гульні. Класіфікацыя гульні (каляндарныя і сямейна-абрадавыя са святочна-абрадавай атрыбутыкай і без яе; гульні, не звязаныя з календаром і абрадамі (ці згубілі сувязь); драматычныя, спартыўныя, арнаментальныя, змешаныя; па ўзроставай дыферэнцацыі).

**Раздзел 1. Асаблівасці рэжысуры тэатралізавана-забаўляльных праграм у народным свяце.**

*Тэма 1. Гульня ў структуры народнага свята*

Месца гульні ў народным свяце. Узаемасувязь гульні і мастацтва. Гульня і развіццё пазнавальнай дзейнасці чалавека. Гульня і развіццё творчай дзейнасці чалавека. Гульня і фізічнае развіццё чалавека. Псіхолага-педагагічныя асновы гульнявых зносін. Гульня як частка духоўнай культуры народа, як від арганізацыі вольнага часу чалавека. Адлюстраванне культурных традыцый у змесце гульні. Гульня як сродак актывізацыі ўдзельнікаў свята. Гульня як форма стварэння перадсвяточнай і святочнай атмасферы.

*Тэма 2. . Методыка правядзення гульняў*

Святочная гульнятэка. Методыка складання гульнявой картатэкі. Патрабаванні да бутафорыі і рэквізіту. Методыка правядзення рухомых гульняў. Методыка правядзення інтэлектуальных гульняў. Настольныя гульні. Гульнявыя конкурсы. Гульні з эстрады. Методыка ўключэння гульні ў праграму танцавальнага вечара, масавага гуляння.

*Тэма 3. Методыка падрыхтоўкі сцэнарыяў гульнявых праграм.*

Драматургія гульнявых праграм. Кампазіцыйная пабудова праграмы. Эпізод як першапачатковы элемент ў структуры сцэнарыя. Уключэнне маналогаў вядучага, вакальнага і харэаграфічнага матэрыялу ў сцэнарый гульнявой праграмы. Мантаж гульнявых эпізодаў. Лагічнасць, рытмічнасць пераходаў і тэкставых звязак у сцэнарыі гульнявой праграмы. Падбор і чаргаванне гульнявых момантаў у залежнасці ад выяўлення інтэлектуальных і фізічных здольнасцей аўдыторыі. Сімвалічны сэнс прызоў і прадметаў у праграме

*Тэма 4. Прафесійныя якасці вядучага гульні. Роля вядучага як арганізатара гульні*

Агульная эрудыцыя, густ, такт, пачуццё гумару вядучага праграмы. Камунікабельнасць, уменне лёгка збліжацца з людзьмі—адно з галоўных патрабаванняў да вядучага гульні. Навыкі акцёрскага майстэрства, мастацтва імправізацыі— неабходныя ўмовы творчай работы вядучага праграмы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівасці работы вядучага на розных этапах гульні. Запрашэнне на гульню.

Патрабаванні да тлумачэння ўмоў гульні:

— сціслацсь;

— лагічнасць у спалучэнні з дакладнасцю і паслядоўнасцю ў тлумачэнні правіл;

Тлумачэнне павінна ўключаць:

— назву гульні;

— роля ігракоў і іх месца размяшчэння;

— ход гульні;

— мэту гульні;

— правілы гульні.

Выкарыстанне ў якасці дэманстратараў гульні персанажаў фальклора, скамарохаў, клоунаў і г.д.

Спосабы падзелу каманд для гульні:

— па прафесійнай прымеце;

— па творчай прымеце;

— па дэмаграфічнай прымеце;

— з улікам узросту;

— з улікам месца жыхарства.

Упраўленне ходам гульні: сігнал да пачатку дзеі, стымуляванне ініцыятывы ігракоў, назіранне за выкананнем правіл, патрабаванне дысціпліны ад ігракоў і назіраючых гульню, падтрымка настрою ўдзельнікаў гульні, арганізацыя работы журы гульнявой дзеі, падвядзенне вынікаў гульні.

Стварэнне ўмоў для выяўлення самадзейнасці ўдзельнікаў. Сцэнічны касцюм вядучага і яго роля ў правядзенні праграмы.

*Тэма 5. Рэжысёрская распрацоўка сюжэтна-гульнёвай праграмы*

Знаёмства студэнта з асаблівасцямі распрацоўкі сюжэтна-гульнявой праграмы на аснове аналізу сюжэтна-гульнявых праграм народных свят каляндарнага цыкла, распрацаваных студэнтамі кафедры рэжысуры свят у мінулыя гады.

Вызначэнне студэнтам пры падрыхтоўцы ўласнай праграмы:

— сцэнарна - рэжысёрскі ход праграмы;

— разнастайнасць гульнявога жанру;

— кампазіцыйная пабудова;

— чаргаванне гульнявых жанраў;

— насычанасць рэплікамі, прымаўкамі, прыказкамі;

— увядзенне персаніфікацыі;

— прыёмы актывізацыі глядачоў;

— рэквізіт і бутафорыя;

— музычнае і мастацкае афармленне праграмы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел 2. Гульня — спецыфічнае мастацка-імправізацыйнае дзеянне народнага свята.

*Тэма 6. Традыцыйныя зімовыя ігрышчы беларусаў*

Генезіс, тэндэнцыі развіцця зімовага гульнёвага комплексу. Карнавальныя традыцыі каляднага ігрышча. Калядныя гульні ў закрытым памяшканні, іх тэрытарыяльныя разнавіднасці, рэквізіт, бутафорыя. Тэатралізаваныя калядныя гульні беларусаў (Жаніцьба Цярэшкі, Яшчар, Жаніцьба Бахара, Халімон і інш.), іх мастацкія сродкі, прыёмы. Пераапрананне і маскаванне — характэрная рыса каляднага ігрышча. Прыход ражаных — падзейны момант ігрышча. Тэрытарыяльныя асаблівасці вырабу калядных карнавалізаваных касцюмаў, масак, рэквізіту.

Калядныя ігрышчы на вольным паветры: “Цягнуць каляду на дуба” (Бярэзенскі раён); “Кола”(Дзяржынскі раён). Гульні на снегавых горках. Калядны карнавал “Конікі” (г.п. Давыд-гарадок Столінскага раёна Брэсцкай вобласці). Карналізаваныя масленічныя гульні беларусаў. Рэгіянальныя адрозненні масленічных гульняў (“Слуп”, “Перацягванне каната”, гульняў на ледзяных і снегавых горках). Гульнёвы характар абрадавых масленічных вяселляў і пахаванняў.

Гульні масленічных карнавалаў беларускай шляхты.

*Тэма 7. Абрадавыя і пазаабрадавыя гульнявыя дзеянні веснавых свят народнага каляндара*

Веснавыя гульні беларусаў. Земляробча-магічны сэнс абрадавых веснавых гульняў і ігрышч (качанне на арэлях, валачэнне калодкі, гульні з яйкамі, варожбы з вянкамі на Сёмуху). Ігрышча “Гуканне вясны”—комплекс традыцыйна-нацыянальных гульняў і забаў. Праяўленне антрапаморфных (баба, дзед) і зааморфных (птушка, тур)  персанажаў ў абрадавых веснавых гульнях. “Тураўскі карагод” — юраўскае ігрышча моладзі. “Ваджэнне і пахаванне стралы”—трансфармацыя старажытнага магічнага абрада у вяселую народную гульню. Культ раслін ў дзявочым сёмушным ігрышчы. Гульнёвыя варожбы на засохлых галінках і вянках.

Роля карагода ў станаўленні ранніх форм беларускага народнага тэатра, сінкрытызм як характэрная асаблівасць карагода. Тыпы карагодаў з пункту гледжання кампазіцыыі: кругавы, адналінейны, двухлінейны. Структура і выразныя сродкі адналінейнага карагода, яго месца ў веснавых святах. Карагод, як калектыўная дзеючая асоба. Прынцып драматызацыі ў двухлінейным карагодзе, франтальная форма яго пабудовы, канфліктны характар  песеннага дыялога.

Кола—асноўны кампазіцыйны п申сторавы элемент кругавога карагода. Развіццё разнастайных тэататральных элементаў у крагавым карагодзе, выдзяленне ў ім асобных выканаўцаў, узнікненне драматычнага дыялога.

Іграввая імітацыя ў карагодзе працоўных працэсаў, павадак звяроў, паводзін чалавека. Развіццё сюжэта і станаўленне дыялагічнай формы—галоўная тэндэнцыя  тэатралізацыі карагода.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гратэсковы характар веснавых дзіцячых гульняў.

*Тэма 8. Гульні беларускага Купалля*

Традыцыйныя купальскія абрадава-гульнёвыя дзеі, якія ствараюць перадсвяточную атмасферу (збор удзельнікаў на свята, карнавалізаванае шэсце па вёсцы). Выбар распарадчыкаў свята (галоўных Купаліша і Купалінку) і іх роля як арганізатараў гульнявых дзей.

Гульнёвыя дзеі экспазіцыйнай часткі (масавыя дзявоцкія варожбы на зяляніне, жытніх каласах). Шлюбная накіраванасць тэатралізаваных купальскіх гульняў, карагодаў: "Марусіначка" (Рэчыцкі раён), "Выбар пары" (Барысаўскі раён). Гульнёва-песенныя спаборніцтвы разнаполых, альбо рознатэрытарыяльных груп, як сродак актывізацыі удзельнікаў свята летняга сонцастаяння. Вогненае ігрышча Купалля (выбар пары, перакідванне вянка, паасобныя і парныя пераскокванне праз агонь, купальскія варожбы з вянкамі), элементы яго тэатралізацыі—выкраданне купальскага агню. Выкарыстанне касцюмаў і масак міфічных істот у купальскіх абрадава-гульнёвых дзеях. Гульнёвы характар абрада "Праводзіны русалкі". Пошук папараць-кветкі як масава-гульнявое дзеянне. Танцавальныя гульні Купалля. Карнавальныя купальскія пераапранання і начныя абыходы вёсак—апафеоз гульнявых дзеянняў свята.

Спецыфічныя гульнявыя дзеянні агульнанародных купальскіх кірмашоў(неафіцыйныя конкурсы гуртоў вясковых музыкаў, конныя гульні, арганізацыя гандлёвых рыбалак, перацягванне каната, спаборніцтвы на вадзе).

Адметныя гульнявыя дзеі купальскіх кантрактовых кірмашоў (наладжванне танцавальных збораў, арганізацыя водных маскарадаў, карнавалаў).

*Тэма 9. Народныя забавы беларускага кірмашу*

Беларускі кірмаш як форма адпачынку прадстаўнікоў розных узроставых і сацыяльных катэгорый насельніцтва. Агульнанацыянальныя рысы і адметныя асаблівасці кантрактовых і агульнанародных кірмашоў. Класіфікацыя гульнявых дзей беларускага кірмашу.

Характэрныя асаблівасці і тэрытарыяльныя адрозненні кірмашовых латарэй—алегры (мінская, латарэя "па спіску", столінская сельскагаспадарчая латарэя, заходнебеларуская грашовая латарэя і латарэі-рулеткі). Гульнявыя і тэхналагічныя адметнасці кірмашовых гандлёва-гульнявых атракцыёнаў (міёрская, пerабродская, жырмундская, браслаўская і палеская рыбалкі, віцебскі, палескі і гродзенскі прызавыя слупы).

Спартыўныя забавы беларускіх кірмашоў (турніры барцоў, выпрабаванні коней скакавых і цяглавых парод, рознаварыянтныя пераправы праз раку, змаганні асілкаў, бегуноў, перацягванне каната, абгонкі "на казе").

Прастораваае вырашэнне, мастацка-дэкаратынае афармленне народных кірмашовых забаў, спосабы актывізацыі ўдзельнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 10. Гульнёвыя элементы ў структуры асенняга абрадавага цыкла*

Рэгіянальныя асаблівасці гульнёвых эпізодаў жніўных абрадаў: завіванне барады, варажбовыя забавы. Прыёмы актывізацыі ўдзельнікаў карнавалізаванага карагода “Жніўны вянок”. Жніўныя варожбы і вераванні дашлюбнай моладзі пад час свята дажынак. Гульні і варожбы шлюбнай накіраванасці пакроўскага свята.

*Тэма 11. Арганізацыя ўдзельнікаў свята метадам гульні*

Адметныя рысы гульні як самастойнага віду чалавечай дзейнасці: наяўнасць гульнявой прасторы, гульнявых правіл і патрэбы ў гульнявой дзейнасці.

Метадычныя асаблівасці гульні:

— вобразнасць;

— самастойнасць дзей у дасягненні мэты;

— творчая ініцыятыва ў дзеях у адпаведнасці з правіламі;

— выкананне асобных ролей у гульні, згодна сюжэту, што ўстанаўлівае пэўныя ўзаемаадносіны ў асяроддзі ўдзельнікаў свята;

— раптоўнасць, зменлівасць сітуацыі ў гульні, якая патрабуе ад удзельнікаў ініцыятывы, хуткай рэакцыі;

— сутыкненне супрацьлеглых інтарэсаў у вырашэнні гульнявых “канфліктаў”, што ставарае высокі эмацыянальны тонус.

Прынцыпы арганізацыі гульнявога эпізоду ў святе, тэматычнае адзінства змесу гульні і свята, мэтазгоднасць выкарыстання гульнявога метаду ўздзеяння, улік настрою ўдзельнікаў свята, адпаведнасць гульні псіхафізіялагічным, сацыяльна-дэмаграфічным характарыстыкам удзельнікаў свята.

Залежнасць выбару гульні для канкрэтнага свята ад наступных фактараў: мэты свята, узроставага складу і колькасці ўдзельнікаў, формы святкавання, месца арганізацыі свята, наяўнасць гульнявога рэквізіту.

Арганізацыя ігракоў на святе ў прасторы (размяшчэнне ў гульнявым полі свята ў мізансцэнах, якія б найлепшым чынам дазвалілі ім чуць правілы гульні і сачыць за яе ходам).

*Тэма 12. Класіфікацыя сучасных народных гульнева – забаўляльных праграм*

Каляндарна – абрадавыя (згодна святам каляндарнага цыкла). Сямейна-бытавыя (вяселле, радзіны, юбілеі). Праграмы экалагічнай накіраванасці (свята лесу, свята кветак, свята птушак, свята на вадзе). Праграмы, прымеркаваныя да свят беларускай культуры (Дзень ведаў, Дзень пісьменства, юбілеі памятных гістарычных падзей, свята народнай музыкі, фестываль мастацтваў, свята гумару). Па ўзроставаму прынцыпу (дзіцячыя, падлеткавыя, маладзёжныя). Па прыкмеце месца правядзення (на адкрытым паветры, ў памяшканні). Па прыкметах сюжэтнага характару (конкурсныя, драматычныя, творчыя, спартыўныя). Па характару арганізацыі калектыву (з раздзяленнем на каманды, без раздзялення).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 13. Арганізацыя пазаабрадавых масава-гульнявых дзеянняў народнага свята*

Рэжысёрская распрацоўка пазаабрадавага масава-гульнявога дзеяння як мастацкі комплекс агульнанацыянальных і мясцовых каманентаў. Асноўныя этапы работы над стварэннем масава-гульнявых дзеянняў народнага свята:

— вывучэнне гульнявых традыцый ў мясцовасці, дзе ўвасабляецца свята;

— знаёмства з геаграфічнымі і архітэктурнымі асаблівасцямі на месцы арганізацыі свята, улік мастацкіх сіл і людскіх рэсурсаў, матэрыяльных магчымасцей населенага пункта;

— вызначэнне тэмы і ідэі ігрышча;

— адбор гульняў;

— пабудова гульнявога раду, сцэнарна-рэжысёрскага ходу;

— кампазіцыйная пабудова ігрышча (пралог, завязка, развіццё дзей, кульмінацыя, развязка, фінал);

— выяўленне спосабаў актывізацыі ўдзельнікаў;

— прасторавае рашэнне гульняў з улікам месца дзеяння;

— работа з арганізатарамі гульняў;

— падрыхтоўка рэквізіту і бутафорыі;

— вызначэнне каштарысу і спосабаў фінансавання гульнявога дзеяння.

*Тэма 14. Сцэнарна-рэжысёрская распрацоўка конкурснай праграмы*

Методыка праядзення камандных конурсаў. Вызначэнне капітана каманды. Арганізацыя ўдзельнікаў конкурснай праграмы на пляцоўцы і месца вядучага сярод іх (дыяганальная, кругавая мізансцэны). Дакладнасць выкладання ўмоў гульні. Ацэнка і каментарый вядучага дзейнасці ігракоў. Арганізацыя гульнявога дзеяння.

1.Экспазіцыя — арганізацыя гульнявой прасторы, фарміраванне гульнявых каманд

2.Завязка — тлумачэнне гульнявых правіл

3. Асноўная дзея:

I сітуацыя — пабуджэнне, стымул да гульнявой дзеі;

II сітуацыя — упраўленне гульнявой дзеяй;

III сітуацыя — актывізацыя глядачоў да гульнёвай дзеі;

4. Кульмінацыя — дасягненне гульнявой мэты

5. Фінал— ушанаванне пераможцаў гульні

## ***Тэматыка и метадычныя ўказанні да практычных заняткаў па прадмету***

*Тэма 1. Гульня ў структуры народнага свята*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вывучыць пытанне аб паходжанні гульні. Заканспктаваць тэорыі розных навукоўцаў аб класіфікацыі гульні. Падрыхтаваць выступленне аб месцы гульні ў структуры дзіцячага свята.

*Тэма 2. Методыка праядзення гульняў*

Зрабіць па 10 гульнявых картак рухомых, інтылектуальных гульняў, конкурсаў. Прааналізаваць сцэнарыі танцавальных вечароў з уключэннем у іх праграмму гульняў і прыдумаць некалькі варыянтаў актывізацыі ўдзельнікаў танцавальнай вечарыны.

Тэма 3. Методыка падрыхтоўкі сцэнарыяў гульнявых праграм.

Аналіз сюжэтна-гульнёвых праграм з архіву кафедры рэжысуры свят, зборнікаў. Вызначыць у гульнёвых праграмах састаўныя элементы кампазіцыйнай пабудовы.

*Тэма 4. Прафесійныя якасці вядучага гульні. Роля вядучага як арганізатара гульні*

Самастойная падрыхтоўка студэнтам уступных маналогаў да тэматычных гульнёвых праграм. Правядзенне гульняў кожным са студэнтаў.

*Тэма 5.Рэжысёрская распрацоўка сюжэтна-гульнёвай праграмы*

Правядзенне папярэдняга рэжысёрскага аналізу сюжэтна-гульнёвых праграм. Вызначэнне сцэнарна-рэжысёрскага хода, асобных эпізодаў праграмы. Увядзенне ў праграму персаніфікаваных вобразаў, абгрунтаванне іх выбару.

*Тэма 11. Арганізацыя ўдзельнікаў свята метадам гульні*

Падрыхтаваць аналіз адной з гульняў рознай тэматычнай накіраванасці (адпаведнасць мэты свята і гульні, узроставага і гендэрнага складу ўдзельнікаў). Падрыхтаваць схему мізансцэніравання (размяшчэнне гледачоў у гульнявым полі свята).

*Тэма 12. Класіфікацыя сучасных народных гульнева – забаўляльных праграм*

Падрыхтаваць па 3 гульнёвых картак згодна класіфікацыі (каляндарна-абрадавыя, сямейна-бытавыя, праграмы экалагічнай накіраванасці, прымеркаваных да свят беларускай культуры, праграмы па ўзроставаму прынцыпу, конкурсныя, спартыўныя).

*Тэма 13. Арганізацыя пазаабрадавых масава-гульнявых дзеянняў народнага свята*

Распрацоўка масава-гульнявых дзеянняў свят, згодна класіфікацыі. Вызначэнне кампазіцыйнай пабудовы, сцэнарна-рэжысёрскага ходу, выяўленне спосабаў актывізацыі ўдзельнікаў, падрыхтоўка масавых гульняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 14. Сцэнарна-рэжысёрская распрацоўка конкурснай праграмы.*

Публічны паказ і аналіз конкурсной гульнявой праграмы. Выявіць станоўчыя моманты і недахопы кожнай з праграм з ліку сваіх аднакурснікаў. Адпаведнасць гульнявой праграмы кампазіцыйнай пабудовы.

***Прапануемая тэматыка для самастойнай распрацоўкі гульнявых праграм***

1. Дзень незалежнасці;
2. Дзень Перамогі;
3. Каляды;
4. Вялікдзень;
5. Юр'е;
6. Свята ураджаю;
7. Новы год;
8. Масленіца;
9. Гуканне вясны;
10. Сёмуха;
11. Купалле;
12. Пакровы;
13. Свята горада, вёскі;
14. Дзень ведаў;
15. Дзень пісьменства;
16. Свята паэзіі і песні;
17. Свята гумару;
18. Свята народнай музыкі
19. Фестываль мастацтваў
20. Святы экалагічнай накіраванасці (свята лесу, птушак, кветак)
21. Рыцарскі турнір;
22. Тэатралізаванае паляванне;
23. Юбілейныя урастасьці;
24. Свята народных рамёстваў;
25. Карнавал, маскарад.

***Кантрольныя пытанні для самаправеркі студэнтаў***

1. Якія функцыі гульні вам вядомы?
2. Раскрыйце этымалогію слоў "гульня", "ігрышчы".
3. Якая класіфікацыя гульні вам вядома?
4. Фізічныя гульні, іх месца ў побыце дзяцей і моладзі.
5. Ролевыя (сімвалічныя) гульні.
6. Расскажыце, якім чынам гульня і гульнёвая сітуацыя з'яўляецца сродкам актывізацыі ўдзельнікаў свята.
7. Ці можа гульня з'яўляцца сродкам перадсвяточнай і святочнай атмасферы? Абаснуйце свій адказ.
8. Назавіце, калі ласка, элементы архітэктонікі гульнёвай праграмы?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. Сфармаліруйце канкрэтнае вызначэнне першапачатковага элемента ў структуры сцэнарыя гульнёвай праграмы.
10. Якая роля надаецца вядучаму ў арганізацыя гульнёвай сітуацыі?
11. Якімі якасцямі павінен валодаць вядучы гульнёвай праграмы?
12. Назавіце спосабы падзелу каманд для гульні.
13. Якія асноўныя этапы кіравання гульнёй павінен выкарыстоўваць вядучы?
14. Раскажыце аб увядзенні персаніфікаваных вобразаў у структуры гульнёвай праграмы.
15. Дайце вызначэнне дыфініцыі сцэнарна-рэжысёрскі ход.
16. Якія прыёмы актывізацыі ўдзельнікаў гульнёвай праграмы вам вядомы?
17. Раскажыце аб карнавальных традыцыях каляднага ігрышча
18. Якія функцыі маюць тэатралізаваныя калядныя гульні беларусаў
19. Назавіце характэрныя рысы каляднага ігрышча.
20. Вызначце, калі ласка, кампазіцыйную пабудову калядных ігрышч.
21. Якія вам вядомы тэрытарыяльныя асаблівасці вырабу каляднага гульнёвага рэквізіту?
22. Раскажыце аб асаблівасцях і функцыянальнай накіраванасці калядных ігрышч на вольным паветры.
23. Раскажыце аб структуры масленічных карнавалаў беларускай шляхты.
24. Земляробча-магічны сэнс абрадавых веснавух гульняў і ігрышч.
25. Шлюбная накіравансасць вясенне-летніх гульняў.
26. Гульнёвыя дзеянні агульнанародных купальскіх кірмашоў.
27. Класіфікацыя гульнявых дзей беларускага кірмашу.
28. Спартыўныя забавы  беларускіх кірмашоў.
29. Рэгіянальныя асаблівасці гульнявых эпізодаў жніўных абрадаў.
30. Прынцыпы арганізацыі гульнявога эпізоду ў свяце.
31. Арганізацыя ігракоў на свяце ў прасторы.
32. Класіфікацыя сучасных народных гульнёва-забаўляльных праграм
33. Асноўныя этапы работы над стварэннем масава-гульнёвых дзеянняў народнага свята.
34. Методыка правядзення камандных конкурсаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Пытанні да заліку па прадмету*

1.Святы, абрады, звычаі і традыцці  іх роля ў жыцці грамадства і асобы.
2.Паняцці “свята”, “ абрад”, “традыцыя”.
3.Тэндэнцыі развіцця народных свят Беларусі на сучасным этапе.
4.Гульня як від чалавечай дзейнасці, яе паходжанне і месца ў народным свяце.
5.Функцыі гульні.
6.Гульня і развіццё пазнавальнай і творчай дзейнасці.
7.Характарыстыка народнай гульні. Адлюстраванне культурных традыцый у змесце гульні.

8.Генезіс і тэндэнцыі развіцця ігрышча.
9.Характэрныя рысы каляднага ігрышча, яго структура і падзеі.
10.Тэатралізаваныя калядныя гульні беларусаў, іх мастацкія сродкі, формы, прыёмы.
11.Калядныя ігрышчы на вольным паветры, гульні на снегавых горках.
12.Масленічныя гульні беларусаў.
13.Гульні масленічных карнавалаў Беларусі.
14.Калядны карнавал "Конікі" у Давыд-гарадку.
15.Калядныя варожбы гульнявой накіраванасці.
16.Веснавыя гульні-карагоды, іх характэрныя асаблівасці і тыпы.
17.Тэатралізаваныя пазаабрадавыя веснавыя гульні.
18.Веснавыя дзіцячыя гульні.
19.Вогненыя ігрышчы Купалля.
20.Традыцыйныя купальскія гульні.
21.Класіфікацыя і агульная характарыстыка гульнявых дзей кірмашу.
22.Характэрныя асаблівасці і тэрытарыяльныя адрозненні арганізацыі кірмашовых латарэй.
23.Гульнявыя і тэхалагічныя адметнасці кірмашовых гандлёва-гульнёвых атракцыёнаў.
24.Спартыўныя забавы кірмашоў.

## Літаратура

*Асноўная*

*Беларускія* народныя гульні і забавы / Уклад. К.Л. Лабчэўская. – Мн., 1990. С.1-31

*Беларускія* народныя танцы, карагоды і гульні / Уклад. В.С. Семенякоў. – Мн.: БелСЭ, 1989. С.3–125

*Вількін Я.Р.* Беларускія народныя гульні. Мн., 1969. С.3-192

*Golebiowski* L. Gry i zabavy roznych stanow w kraju calym, lub niektorych tylko prowincyach. Warszawa, 1831. С.234- 385

*Гуд* П.А. Святы, якія заўжды з намі: Гульнявыя праграмы "Ад Каляд да Пакроваў". – Мн.: Красіка-Прынт, 1999. С.5-210

*Гуд* П.А. Беларускае купалле: кампазіцыя і семантыка абрадавых дзей.- Мн.: БДУ культуры, 1999. С.56-136

*Гуд* П.А. Гуд Н.І. Беларускі кірмаш. – Мн.: Полымя, 1996.С.19-98

*Гульні,* ігрышчы, забавы / Рэдкал.: А.С. Фядосік і інш. – Мн.: Бел.навука, 1996. С.3-532

*Гурскі* А.І. Святкаванне Каляд на беларусі. – Мн.: Навука і тэхніка, 1998. С.10- 168

*Дзіцячыя* фальклорныя гульні / Уклад. З.Л. Леановіч, Н.А. Рылькова. – Мн.: Нар. Асвета, 1995. С.3- 32.

*Дзіцячы* фальклор / Склад.: Г.А. Барташэвіч. – Мн.: Навука і тэхніка, 1972. С.234-341

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Жаніцьба* Цярэшкі / Уклад. Л.М. Салавей і І.Дз.Назінай. – Мн.: Навука і тхніка 1993. С.4-235

*Кухаронак* Т.І. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў.- Мн.: Ураджай, 2001. С.3- 238

*Народны* тэатр / Уклад. М.А. Каладзінскі – Мн.: Навука і тэхніка, 2003. С.25-134

*Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў. Т.1. Магілёўскае Падняпроўе / Т.Б. Варфаламеева, В.І. Басько, М.А. Козенка і інш – Мн.: Бел. навука, 2001. С.10-111.

*Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў.Т.2.Віцебскае Падзвінне/ Т.Б. Варфаламеева, В.І. Басько, М.А. Козенка і інш. – Мн.: Бел.навука, 2004. С.10-98

*Дадатковая*

*Беларускі* дзіцячы фальклор. Традыцыйныя запісы, апрацоўуі і аўтарскія творы / Склад. А.М. Аляхновіч, М.В. Рахчэеў, А.С. Фядосік, У.Д. Каструлёў. – Мн.: Беларусь, 1994. С.123-267

*Зборнік* сцэнарыяў культурна-відовішчных праграм “На крылах творчасці” / Уклад. Гуд П.А. – Мн.: ТДА “Ларанж-2”, 2001. С.3- 68

*Зборнік* гульнёва-забаўляльных праграм для арганізатараў вольнага часу “Весяліцца – не журыцца” / Уклад. К.Л.Лабчэўская. – Мн.: 1998. С.3- 86

Зборнік гульнёвых праграм “*У гасцях* у гаспадыні прыроды” / Уклад.: П.А. Гуд, К.М. Пятровіч. – Мн., 2000. С3-39

*Котаў* М. Народныя гульні.- Мн., 2004.С.3-36

*Каминский* А.Я. Методика подготовки и проведения игровой программы // Методическое пособие № 22 ГКДУ “ЦДО” ВС РБ. – Мн.: 2001. С.23-30

*Каминский* А.Я. Сценарная разработка детской игровой программы // Методическое пособие № 21 ГКДУ “ЦДО” ВС РБ. – Мн.: 2001. С.45-50

*Подвижные* игры в детском саду: Пособие для педагогов дошк. учреждений / Т.Г Лихадиевская, И.М. Ивановская. – Мн.: Беларусь, 2002. – 240 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### ***Выкарыстанне тэхнічных сродкаў, аудыёвідэаматэрыялаў***

1. На працягу тэрміна навучання студэнты знаёмяцца з відэазапісам экзаменацыйных паказаў па прадмету “Беларускія народныя гульні” папярэдніх курсаў з архіву кафедры рэжысуры абрадаў і свят.

2. Праслухоўванне, падбор і мантаж аўдыаматэрыяла у фанатэцы кафедры рэжысуры абрадаў і свят для музычнага афармлення гульнёвых і конкурсных праграм.

3. Выкарыстанне падчас лекцыйных і практычных заняткаў фотаздымкаў на лічбавых носьбітах папярэдніх экзаменацыйных паказаў па

прадмету “Беларускія народныя гульні”, Рэспубдліканскіх, Міжнародных свят, конкурсаў культарганізатараў.

4. Выкарыстанне электронных метадычных зборнікаў і сцэнарных распрацовак гульнёвых праграм выкладчыкаў кафедры рэжысуры абрадаў і свят.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ